# § 1. МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНАЙ ЭПОХІ: ПАСЛАННЕ НАШЧАДКАМ

Сучасным людзям не толькі цікава, але і важна ведаць, калі ўзнікла мастацтва і чаму чалавек пастаянна да яго звяртаецца. Аб прычынах яго ўзнікнення існуе мноства тэорый. Кожная з іх часткова праўдзівая.

***З'яўленне мастацтва: ад пераймання да творчасці.*** Дакладны час з'яўлення мастацтва назваць складана. Але можна з упэўненасцю сказаць, што мастацтва ўзнікла ў каменным веку. Менавіта тады ў першабытнага чалавека нарадзілася патрэбнасць выказваць эмоцыі і пачуцці, упрыгожваць сваё жыццё, спазнаваць тайны навакольнага свету.

У першабытны час людзі не аддзялялі сябе ад прыроды, лічылі сябе яе часткай. Усе заняткі чалавека — штодзённае жыццё, мастацкая дзейнасць, абрады і рытуалы — былі зліты ў адно. Танцуючы, здзяйсняючы рытуалы, размалёўваючы сцены пячор, людзі яшчэ не ўсведамлялі, што займаюцца мастацтвам. Напэўна, так яны імкнуліся паўплываць на навакольны свет, часта суровы і непрыязны. Усё, што рабіў чалавек, падпарадкоўвалася практычным мэтам і павінна было прынесці ўдачу, забяспечыць добрае надвор'е, даць здароўе.



Выява бізона ў пячоры Шульган-Таш, Расія (каменны век)

Першабытныя людзі думалі, што ўсё ў навакольным свеце (сонца, неба, вецер), як і чалавек, мае душу, разумее маўленне, мае патрэбу ў харчаванні і сне. Таму ўсім з'явам, ад якіх залежала жыццё людзей, яны *спраўлялі ахвярапрынашэнні*. Звароты да сіл прыроды пераўтварыліся ў абрады. У час правядзення абраду не было падзелу на гледачоў і выканаўцаў. У такую дзейнасць уключаліся людзі і ўсё тое, з чаго складвалася іх жыццё: рэальныя прадметы, выявы чалавека і жывёл, шкуры звяроў і маскі.

Мастацтва першабытнай эпохі ахоплівае каменны, бронзавы і жалезны вякі.

Спачатку чалавек *імкнуўся пераймаць прыроду*: напрыклад, капіраваў у танцах і песнях звычкі і гукі жывёл. Пазней ён навучыўся адлюстроўваць жывых істот. Чалавек шчыра верыў у сілу свайго мастацтва: ён маляваў сцэну паспяховага палявання і чакаў, што гэта дапаможа яму і ў рэальнасці вярнуцца са здабычай.


Кара́лі, Чэхія (каменны век)

Аднак першабытныя людзі не толькі малявалі коп'і, што патрапілі ў адлюстраванага звера, але і *«гулялі» з малюнкамі* — на многіх наскальных малюнках жывёл бачныя сколы ад удараў каменных стрэл і коп'яў. Чалавек надзяваў упрыгажэнне з іклоў і зубоў магутнага мядзведзя і чакаў, што яно стане талісманам: надасць яму дадатковую сілу і адвагу. Напэўна, старажытныя людзі спадзяваліся, што гэта можа прынесці ўдачу на паляванні.

*Разгледзьце прыклады ранняга мастацтва. Уявіце сабе людзей, якія іх стваралі. Як вы думаеце, што ў гэтых выявах зачароўвае і хвалюе сучаснага гледача?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне